przeddziejowej i badaniom pierwotnej kultury polskiej i słowiańskiej – 2006/2008. – № 7 (48)/B. – С. 107–137.

4. *Рябцевич, В. Н.* Топография монетных кладов Белоруссии : дис. … канд. ист. наук / В. Н. Рябцевич. – Ленинград, 1965. – 600 с.

5. Скарбы Нумізматычнага кабінета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / уклад.: В. Сідаровіч, А. Плавінскі. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2014. – 20 с.: іл.

УДК 001.891.32:316.7Ядвігін Ш.

**Т. Ф. Сухоцкая,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*

**Л. А. Андрэева,**
*студэнтка 302 групы факультэта сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*

# З ВЕРАЙ У СВЕТЛЫ ІДЭАЛ АДРАДЖЭННЯ

Духоўная спадчына Ядвігіна Ш. разглядаецца не толькі ў кантэксце культуры нацыянальнага адраджэння пачатку XX ст., але паказваецца актуальнасць праблематыкі яго твораў для сучаснага беларускага грамадства. Падкрэсліваецца скіраванасць яго творчасці на адраджэнскія ідэалы, якія выкрышталізоўваліся ў асяродку маладой нацыянальнай інтэлігенцыі, знаходзілі сваё выяўленне ў мастацкіх тэкстах пісьменніка. Паказваецца адметнасць стылю Ядвігіна Ш., асновай якога стала гарманічнае спалучэнне сэнсаў народнай культуры, яе маральна-эстэтычных ідэалаў са стылёвымі напрамкамі імпрэсіянізму, сімвалізму і экспрэсіянізму. Адзначаецца разнастайнасць формаў мастацкай творчасці пісьменніка, у якіх ён здолеў актуалізаваць патэнцыял беларускай гутарковай стылістыкі – байка, анекдот, лірычная імпрэсія, відзяжы, жыціе, філасофская навела, прыпавесць, раман. Падкрэсліваецца асветніцкая парадыгма духоўнай спадчыны Ядвігіна Ш., яе сувязь з адраджэнскімі інтэнцыямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ключавыя словы:** ідэал, культура нацыянальнага адраджэння, мова, стыль, форма, сімвал.

**T. F. Sukhotskaya,**
*Candidate of Cultural Studies, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution “Belarusian State University of Culture and Arts”, Minsk*

**L. A. Andreeva,**
*A student of group 302 of the Faculty of Social and Cultural Activities of the Educational Institution “Belarusian State University of Culture and Arts”, Minsk*

## WITH FAITH IN THE BRIGHT IDEAL OF REBIRTH

The spiritual heritage of Yadvigin S. is considered not only in the context of the culture of the early twentieth century national revival, but also the relevance of his works` key themes for modern Belarusian society is shown. The focus of his work on the renaissance ideals, which crystallized among the young national intellectuals, and found expression in the literary texts of the writer, is emphasized. The article shows the distinctive style of Yadvigin S., the basis of which was a harmonious combination of the meanings of folk culture, its moral and aesthetic ideals with the stylistic trends of impressionism, symbolism and expressionism. The variety of forms of the writer's artistic creativity in which he managed to actualize the potential of the Belarusian conversational style, is noted. These are fable, joke, lyrical impression, visions, biography, philosophical novella, parable, novel. The educational paradigm of the spiritual heritage of Yadvigin S., its connection with the renaissance intentions, is emphasized.

**Key words**: ideal, culture of national revival, language, style, form, symbol.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На небасхіле адраджэнскай культуры пачатку ХХ ст. постаць Ядвігіна Ш. з’яўляецца загадкавай і як след не ўсвядомленай. Глыбіня яго твораў, адметнасць стылю, заглыбленасць у народную культуру і ментальнасць беларусаў не могуць быць

не асэнсаваны на тэарэтычным узроўні падчас сучаснага цывілізацыйнага разлому з мэтай спасціжэння патэнцыялу нацыянальнай культуры як духоўнага падмурка далейшага развіцця нашага грамадства. Адраджэнскі ідэал стаў пуцяводнай зоркай, светачам для жыцця і шматграннага таленту Ядвігіна Ш. (сапраўднае імя – Антон Іванавіч Лявіцкі (4 студзеня 1869 г. – 24 лютага 1922 г.) як аднаго з пачынальнікаў беларускай прозы, жыццёвы і творчы шлях якога быў своеасаблівым і складаным. Ён жыў на пераломе двух стагоддзяў, двух сацыяльных эпох, быў вучнем В. Дуніна-Марцінкевіча, паплечнікам Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Верас, старэйшым сучаснікам Цішкі Гартнага, М. Гарэцкага, З. Бядулі. Выбар псеўданіма навукоўцы звязваюць з імем каханай дзяўчыны пісьменніка (Ядвіга Шабуневіч з Радашковіч). Ядвігін Ш. увайшоў у беларускую культуру не толькі як паэт, публіцыст, драматург, крытык, перакладчык, празаік, аўтар твораў з фальклорнай асновай і ўзораў рэалістычна-псіхалагічных апавяданняў, лірычных імпрэсій, першага беларускага рамана, але і як грамадскі дзеяч на глебе беларускага культурна-нацыянальнага адраджэння.

Істотны ўклад у вывучэнне духоўнай спадчыны пісьменніка ўнеслі беларускія мовазнаўцы, літаратуразнаўцы. На мову яго твораў звярнулі ўвагу Л. Голубева, Я. Карскі, Н. Нямковіч, Р. Шкраба. Ф. Янкоўскі ў кнізе «Прыпыніся на часіну» падкрэсліваў, што «… мы дасюль яшчэ … не акрэслілі яго [Антона Лявіцкага] пачэснага месца сярод руплівых і шчырых, умелых і таленавітых шукальнікаў норм літаратурнай мовы, сярод тых, хто не па кропельцы, а ручаямі ўлівалі здабыткі народнай мовы ў маладую яшчэ, але бурную плынь літаратурнай мовы на пачатку XX стагоддзя» [5, с. 156–162]. Пра творчасць Ядвігіна Ш., пра яе супярэчнасць, адметнасць пісалі М. Багдановіч, Т. Дасаева, А. Дышлевіч, В. Каваленка, А. Лойка, В. Максімовіч, А. Рагуля, Я. Саламевіч, П. Ткачова, І. Чыгрын і інш. Большасць іх прац сканцэнтравана, галоўным чынам, на разглядзе твораў пісьменніка ў кантэксце гісторыі развіцця беларускай літаратуры, яе жанравых і стылявых адметнасцях. Падрабязныя біяграфічныя звесткі пра Ядвігіна Ш. падаюцца ва ўспамінах дачкі Ванды Лёсік (беларускай літаратаркі, жонкі вядомага беларускага грамадска-палітычнага і культурнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеяча Язэпа Лёсіка) [3] і паплечніцы Палуты Бадуновай [1]. Мэтазгоднасць культуралагічнага асэнсавання здабыткаў нацыянальнай літаратуры матывуецца неабходнасцю аднаўлення рэсурсаў людскасці, закладзеных у родным слове, якое валодае магутнай сілай яднання народа ў культурную нацыю.

Антон Лявіцкі быў нашчадкам старога беларускага шляхецкага роду каталіцкага веравызнання, які меў вялікія зямельныя надзелы на Міншчыне і Віленшчыне. Паступова сям'я абяднела і бацьку будучага пісьменніка застаўся толькі невялічкі маёнтак на Віленшчыне. Ян Лявіцкі быў афіцэрам расійскай арміі, але падчас паўстання 1863 г. з-за сваіх грамадска-палітычных перакананняў падаў у адстаўку, бо не захацеў ісці супраць паўстанцаў. Потым была жаніцьба з Вольгай Валіцкай, праца на пасадзе ўпраўляючага маёнтка Дабосна на Магілёўшчыне і нараджэнне сына Антона ў 1869 г. Хутка сям'я Лявіцкіх пераязджае на Міншчыну, у Пяршаі, уладанні графа Тышкевіча, дзе Ян займае пасаду падлоўчага. Затым перабіраюцца ў свой уласны фальварак Карпілаўку (каля Вілейкі), што знаходзіўся пры паштовай дарозе на Радашковічы. Тут і правёў сваё дзяцінства Антон Лявіцкі.

Рэчаіснасць тагачаснага беларускага жыцця была такой, што фальварачная шляхта цесна кантактавала ў паўсядзённым жыцці з вёскай. Жывая сувязь з мясцовымі звычаямі, традыцыямі збліжала шляхту і народ. У такіх умовах і праходзіла маленства Антона Лявіцкага, які чуў беларускія песні і найпрыгажэйшую беларускую мову. Фарміраванне эстэтычнага густу, мастацкага таленту, любові да роднай зямлі адбывалася ў кантэксце народнай культуры. Гэтыя акалічнасці паспрыялі глыбокаму разуменню народнай душы, мар і жаданняў беларускага мужыка, вялікага спачування да яго пакут і бяспраўя, непрыняцця цемрашальства, забабонаў і невуцтва ў сялянскім асяроддзі. Усё гэта з дзяцінства да смерці злучала з радзімай і беларускім народам. Менавіта з маленства ў памяці захаваліся самабытныя, яркія тыпы сялян і шляхты, якія пазней стануць героямі твораў Ядвігіна Ш.

Пэўны час малы Антось наведваў нелегальную прыватную школу ў фальварку Люцынка, заснаваную дачкой В. Дуніна-Марцінкевіча Камілай. Успаміны пра вядомага пісьменніка і атмасферу, якая панавала ў яго доме, Ядвігін Ш. будзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзгадваць усё жыццё, пранікліва апіша гэта ў «Лістах з дарогі». Ацэньваючы пазней адраджэнскі рух, будзе наракаць, што ў штодзённым жыцці В. Дунін-Марцінкевіч не змог праявіць сябе сапраўдным беларусам (артыкул «В. Марцінкевіч у практычным жыцці», 1910). Не толькі абуджэнне народа было трывожным, але і найбольш актыўных дзеячаў адраджэння.

Далейшае навучанне Лявіцкага працягваецца ў Мінскай гімназіі, а затым у Маскоўскім універсітэце на медыцынскім факультэце. У 1890 г. за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў арыштаваны і зняволены на некалькі месяцаў у Бутырскую турму, а пасля – у Петрапаўлаўскую крэпасць. Менавіта тут пачаў сваю літаратурную дзейнасць: пераклаў на беларускую мову апавяданне У. Гаршына «Сігнал», якое было надрукавана у 1891 г. У час зняволення становіцца сведкам зладжанага студэнтамі-арыштантамі канцэрта, на якім са сваімі нацыянальнымі песнямі і танцамі выступалі рускія, украінцы, літоўцы, латышы, каўказцы і інш. У сцэне з успамінаў «Бутыркі» пісьменнік апісвае карціну абуджэння нацыянальнай самасвядомасці ў зняволеных студэнтаў пад уплывам паўзабытай роднай мовы і роднай песні.

Пасля вызвалення быў выключаны з універсітэта і замест дыплома доктара мусіў задаволіцца пасведчаннем аптэкарскага практыканта (памочніка правізара). Вярнуўся ў Беларусь і стаў працаваць памочнікам правізара ў мястэчку Радашковічы, у 1895 г. ажаніўся з мясцовай швачкай Люцыяй Аляксандраўнай Гнатоўскай. Тут ён становіцца актыўным членам гуртка мясцовых беларусаў-інтэлігентаў, якія ладзяць літаратурныя вечары. Ядвігін Ш. у 1892 г. напісаў камедыю «Злодзей» для пастаноўкі яе на сцэне з мэтай перадаць сабраныя грошы за спектакль на адкрыццё бальніцы ў Радашковічах. Але спектакль быў забаронены паліцыяй, п’еса не была надрукавана і прапала ў рукапісе.

Перажыванні пагоршылі здароўе Ядвігіна Ш., ён вымушаны быў адмовіцца ад работы ў аптэцы. Некаторы час загадваў магазінам запаснога насення землеўласнікаў, а ў 1897 г. перабраўся з сям’ёй у свой невялічкі фальварак Карпілаўку і заняўся сельскай гаспадаркай: садзіць вялікі фруктовы сад, ліпы, клёны і іншыя дрэвы. Шмат фізічных сіл палажыў, каб расчысціць з сынам сваю неўрадлівую зямельку ад камянёў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цяжкая праца, галоднае жыццё канчаткова падарвалі здароўе пісьменніка. Вечныя матэрыяльныя недахопы не далі магчымасці атрымаць адукацыю малодшым дзецям.

У Карпілаўцы пісьменніка стаў наведваць юны сусед, сын арандатара Дамініка Луцэвіча, з якім яны вельмі зблізіліся. Гаспадар разам з госцем абмяркоўвалі творы Адама Міцкевіча, Элізы Ажэшкі, Юзэфа Крашэўскага. Ядвігін Ш. дапамог пачынаючаму паэту выбраць гучны псеўданім – Янка Купала. Народны пясняр успамінаў, што ўпершыню сустрэў пісьменніка, які піша па-беларуску.

У 1903–1904 гг. Ядвігін Ш. актыўна супрацоўнічаў з мінскімі і віленскімі прагрэсіўнымі выданнямі: выступаў з апавяданнямі, публіцыстычнымі артыкуламі і карэспандэнцыямі мясцовага характару на рускай і польскай мовах, дзе закранаў праблемы перыядычных выданняў на роднай мове, сялянскага жыцця і інш. Рэвалюцыя 1905–1906 гг. стала звязвае Ядвігіна Ш. з беларускім нацыянальным рухам. Пісьменнік з вялікім энтузіязмам бярэцца за літаратурную працу, уключаецца ў культурна-асветніцкую работу.

Перыяд з 1906 г. па 1914 г. з'яўляецца найбольш плённым для пісьменніка. Першае ўласнае апавяданне Ядвігіна Ш. на беларускай мове было надрукавана толькі ў 1906 г. у трэцім нумары «Нашай долі» і мела назву «Суд». Ядвігін Ш. уваходзіць у беларускую культуру як паэт, публіцыст, драматург, крытык, перакладчык, празаік. Ён друкуе шмат апавяданняў, цікавых артыкулаў, выступае з успамінамі, піша нататкі з падарожжа па роднаму краю. Уздымае ў творах праблемы гаротнага эканамічнага становішча, палітычнага і нацыянальнага бяспраўя беларусаў.

Па-сапраўднаму раскрываецца літаратурны талент Ядвігіна Ш. на старонках «Нашай нівы» і падчас працы ў ёй (пэўны час кіраваў літаратурным аддзелам). Вакол газет «Наша доля» і «Наша ніва» згрупаваліся сілы беларускай інтэлігенцыі, пашырыліся літаратурныя сувязі Ядвігіна Ш., што спрыяла крышталізацыі адраджэнскага ідэалу ў яго творах.

Пісьменнік імкнуўся адлюстраваць і ацаніць рэальнае жыццё ў святле эстэтычных ідэалаў беларускага фальклору, увасобленых у народнай песні і мове, як цэласнасці чалавечага і прыроднага свету. Ядвігін Ш. змог актуалізаваць патэнцыял

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай гутарковай стылістыкі ў разнастайных жанравых формах: байцы, анекдоце, лірычнай імпрэсіі, відзяжы, жыціі, філасофскай навеле, прыпавесці, рамане [4]. У гэты час выйшлі яго тры кнігі: «Дзед Завала» (Вільня, 1910 г.), зборнікі апавяданняў: «Бярозка» (Вільня, 1912 г.) і «Васількі» (Вільня, 1914 г.).

Апавяданні ў названых зборніках можна падзяліць на гумарыстычныя і з глыбокім сацыяльна-бытавым і псіхалагічным зместам. Большая частка твораў – гэта мастацкая апрацоўка анекдотаў, у якіх аб'ектам жартаў становіцца прастадушны селянін. Ядвігін Ш. не проста высмейвае яго наіўнасць і прыдуркаватасць, а рэзка асуджае сацыяльную няроўнасць у грамадстве, махлярства і ашуканства. Антыподамі простага вяскоўца выступаюць гараджане, паны («Пазыка», «З маленькім білецікам», «Заморскі звер», «Вучоны бык»). Найбольш цікавымі з'яўляюцца апавяданні пра быт простых людзей: «Жывы нябожчык» (высмейваецца пустата, бессэнсоўнасць жыцця шляхты), «Важная фіга» (паказваецца сварка паміж нявесткай і злой свякрухай, забітасць селяніна перад вясковай адміністрацыяй), «Суд» (сатыра на суддзяў, якія не валодаюць мовай сялян).

Па форме апавяданні Ядвігіна Ш. можна падзяліць на рэалістычныя і алегарычна-сімвалічныя. У апавяданні «Гаротная» сялянка лечыць сына, абкурваючы яго зеллем, якое параіла знахарка. Для большай эфектыўнасці лячэння яна пільнуе, каб дым не выходзіў з хаты – хлопчык задыхнуўся. Пісьменнік паказаў праз просты сюжэт багаты змест. Але робіць ён гэта не проста як апісальнік быту, а ўспрымаючы жыццё сэрцам. Яму ўдалося пранікнуць у душу гаротнай жанчыны і даць жывыя абразкі яе шматпакутнага быцця. Апавяданні Ядвігіна Ш. прадстаўляюць крык душы чалавека, які аказаўся заложнікам сацыяльных супярэчнасцей. Беднасць сялян правакуе фізічную смерць, даносы на суседзяў, маральнае распуства.

Алегорыі пісьменніка – невялічкія па памеры апавяданні-байкі на розныя тэмы і з багатай эмацыянальнай афарбоўкай: гумарыстычныя, з'едліва-сатырычныя, лірычныя. Сутнасць класавых узаемаадносін паказана ў творы «Павук», дзе выяўлена супрацьлегласць двух ідэалогій праз сімвалы павука і мухі, капіталістаў і пралетарыяту, ката і ахвяры. У байцы «Вяселле» ў вобразе каршуноў выкрываецца каставая замкнёнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шляхты, яе няздольнасць па-сапраўднаму зблізіцца з народам, пазбавіцца сваёй эксплуататарскай сутнасці.

Шмат твораў Ядвігін Ш. прысвяціў нялёгкай жаночай долі. У алегарычным апавяданні «Бярозка» нават дрэва не вытрымала скаргаў Марылькі, якія яна несла яму – спарахнела ўнутры. Тут паказваецца непарыўная сувязь чалавека з прыродай, з агульным рытмам касмічнага жыцця. Гэты ж матыў адлюстраваны і ў прытчы «Дуб-дзядуля». Сімвал старога дуба з'яўляецца выяўленнем архетыпа самасці, гармоніі і мудрасці чалавечай асобы. Паказ векавога гора беларуса (возеры поту, слёз і крыві) і дзейснай сілы адраджэнскага руху (чыстая жывая вада) растаўляе акцэнты ў практычнай праграме рэалізацыі пабудовы новага грамадства. Шматзначнасць гэтых сімвалаў будзе поўна раскрыта ў творчасці Якуба Коласа, Янкі Купалы і іншых прадстаўнікоў нацыянальнага адраджэння.

Ярка выявілася ў творчасці Ядвігіна Ш. сатырычна-гумарыстычная плынь, уласцівая беларускаму казачнаму эпасу. «Максім Багдановіч у артыкуле "Новый период в истории белорусской литературы" (1912) назваў пісьменніка байкапісцам. І сапраўды, пераважная большасць алегарычных апавяданняў Ядвігіна Ш. па форме, стылі, па сатырычнай накіраванасці нагадвае байкі ў прозе» [2, с. 90]. Выдатна ўдалася яму байка «Рабы» – з'едлівая сатыра на чалавечае хамства.

Ядвігін Ш. не толькі майстар мастацкага слова, ён выдатна валодаў пяром публіцыста. «Лісты з дарогі», «Думкі з падарожжа», «Думкі кутніка» – узоры беларускай публіцыстыкі дакастрычніцкага перыяду. У 1910 г. Ядвігін Ш. зрабіў пешшу падарожжа з Вільні па Ашмянскім тракце (27 мая – канец верасня). Пісьменнік прайшоў больш за 400 вёрст, наведаў шмат вёсак, мястэчак і хутароў, пазнаёміўся з рознымі людзьмі. Свае ўражанні, роздум выклаў у публіцыстычных нарысах, можна сказаць краязнаўчых, «Лісты з дарогі». У нататках адлюстраваны штодзённыя клопаты селяніна, яго быт, эканамічны стан вёскі. Скразной з'яўляецца ўвага да мовы беларуса, якая, як лічыў Ядвігін Ш., ёсць падмурак нацыятворчасці. Моўны фактар з'яўляецца своеасаблівым кодам для разумення адраджэнскай ідэі. Прыгнятае аўтара беднасць беларускіх вёсак, безгаспадарлівасць, нядбайнасць мужыцкая, п'янства, неўраджайнасць зямлі. Галоўная прычына гэтай бяды селяніна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на думку Ядвігіна Ш., у беззямеллі і бяспраўі, у бессвядомасці простага люду. Шмат добрых слоў сказана і пра гасціннасць беларусаў, іх імкненне захаваць чысціню сваёй гаворкі, традыцыі і звычаі.

Ядвігін Ш. быў не толькі таленавітым майстрам слоўнай творчасці, але і актыўным грамадскім дзеячам. Да пачатку вайны 1914 г. жыў у Мінску, быў адным з арганізатараў і тэхнічным рэдактарам штомесячных часопісаў «Саха» і «Лучынка». Потым актыўна арганізоўваў Беларускае таварыства дапамогі ахвярам вайны, ставіў спектаклі, выступаў на сцэне, за свой кошт выдаў зборнік «Беларускія жарты» (1915), некалькі сельскагаспадарчых брашурак. Не спыняецца і пісьменніцкая дзейнасць Ядвігіна Ш. Ён супрацоўнічае ў газеце «Беларусь», друкуе там свой раман «Золата» (1920), які стаў адным з першых твораў буйнога эпічнага жанру ў беларускай літаратуры. На жаль, твор не закончаны.

Акрамя літаратурнай і грамадскай работы, прыходзілася цяжка працаваць, каб зарабіць на хлеб. Празмерная работа, дрэнныя матэрыяльныя і кватэрныя ўмовы далі пачатак цяжкой хваробе (сухоты горла). Восенню 1920 г. зусім хворы Ядвігін Ш. выехаў у Вільню. У 1921 г. выдае свае «Успаміны» на польскай мове, якія таксама засталіся незакончанымі. 24 лютага 1922 г. у Вільні на бальнічным ложку, у разлуцы з сям'ёй пісьменнік памёр.

Ядвігін Ш. у сваіх творах імкнуўся абудзіць у сацыяльных нізах патрэбу ў фарміраванні новага беларускага грамадства, якое можа быць пабудавана найперш праз адраджэнне культуры. У развіцці нацыянальнай самасвядомасці, беларускай культурнай прасторы ён аддаваў прэрагатыву беларускай мове, з якой і пачынаецца духоўнае абуджэнне і вяртанне суб'екта культурнай творчасці, багацце і простая веліч якой былі відавочныя. Шматлікія словы, словазлучэнні, звароты, ужываныя Ядвігіным Ш., сталі агульнабеларускімі. Сваёй творчасцю і жыццём пісьменнік сцвярджаў адраджэнскі ідэал, які падразумевае годнасць і каштоўнасць асобы чалавека, яго гарманічнае суіснаванне з прыродай, грамадой, высокую культуру міжасобасных зносін.

Здабыткі духоўнай спадчыны Ядвігіна Ш. узбагацілі вялікія дасягненні беларускай нацыі ў мастацкай культуры і асабліва ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкай літаратуры, якая адкрывае новыя рэсурсы духоўнасці, неабходныя еўрапейскаму чалавецтву сёння, якое апынулася ў лоне прагматызму, разумець, цаніць і ўдасканальваць духоўныя і сацыяльныя ідэалы, створаныя продкамі. Адзначаючы заслугі Ядвігіна Ш. у нацыянальнай культуры, мы павінны гаварыць пра яго як пра самабытнага і арыгінальнага мастака, у творчасці якога багацце і сіла беларускай мовы, ментальнасць народа раскрыліся ва ўсёй глыбіні. Гуманнасць, праўда, людскасць, эстэтыка зямнога чалавечага быцця сталі складнікамі адраджэнскай культуры на пачатку XX ст. і застаюцца ідэаламі беларускай будучыні.


1. *Бадунова, П.* Пасьмертныя ўспаміны. Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі). † 24. II. 1922 г. / П. Бадунова // Адраджэньне : часопіс. – 1922. – № 1. – С. 267–271.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т 1. 1901–1920 / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 583 с.

3. *Лёсік, В.* Пасьмертныя ўспаміны. Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі). † 24. II. 1922 г. / В. Лёсік // Адраджэньне : часопіс. – 1922. – № 1. – С. 265–267.

4. *Рагуля, А.* Трывожнае абуджэнне: Проза Ядвігіна Ш. / А. Рагуля // Роднае слова. – 2009. – № 1. – С. 9–11.

5. *Янкоўскі, Ф.* Прыпыніся на часіну / Ф. Янкоўскі. – Мінск : Мастац. літ., 1979. – С. 156–162.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ